

*Пераможца Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі "Залатая Літара"*

MCMXL

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

# ГРОДЗЕНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1986 года

Выходзіць адзін раз на месяц

№ 7 (497)
8 верасня 2020 года

Распаўсюджваецца бясплатна


# Інтэрнат вітае навасёлаў!



Стар. 5

## ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ


АФІЦЫЙНА

**Актуальны дыялог**

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама сустрэўся з працоўным калектывам ГрДУ імя Янкі Купалы

Стар. 2

ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ-2020

**Залічаны!**
**або**
**Хто ён, першакурснік-2020**

Асаблівасці сёлетняга набору ва ўніверсітэт

Стар. 3

ПАДЗЕЯ

**Стратэгія будучыні**

Пашыраны Савет універсітэта, прымеркаваны да пачатку новага навучальнага года, прайшоў у ГрДУ імя Янкі Купалы

Стар. 4

Официально

# Актуальный диалог

**Председатель Гродненского облисполкома Владимир Караник посетил Гродненский государственный университет имени Янки Купалы и встретился с трудовым коллективом. Мероприятие в формате открытого диалога прошло 28 августа.**



В начале своего выступления Владимир Караник поздравил коллектив с новым учебным годом, подчеркнув ответственность, которая сопровождает профессиональную деятельность педагога, ведь нередко влияние учителя на ученика является судьбоносным.

*– Педагог не просто должен давать информацию ученику, а учить находить её, не просто давать ответ на задачу, а учить решать её. Он должен научить думать, прогнозировать и оценивать последствия своих действий,* – отметил Владимир Степанович.

Обращаясь к трудовому коллективу, губернатор остановился на внутриполитической ситуации в стране, подчеркнув, что сегодня изменения действительно необходимы в разных сферах общества, но все они возможны только в условиях конструктивного диалога:

*– Мир меняется, и мы должны меняться вместе с ним. Нам нужны изменения в экономике, модернизация предприятий, освоение новых технологий и рынков сбыта, конституционная реформа и перераспределение полномочий между ветвями органов власти. Принятие новой конституции и последующие выборы на всех уровнях власти – наиболее верный путь, который позволит сохранить то хорошее, что уже есть, и добавить новое.*

Губернатор высказался о том, что политические взгляды общества должны выражаться в рамках партий и общественных объединений, а юристы и социологи университета могут дать советы и внести дельные предложения:

*– Если есть такой запрос, то я как представитель власти готов оказать всяческое содействие в создании общественных объединений. Только в нормальной дискуссии рождаются здравые идеи, которые позволяют двигаться вперёд. Если нам не нравятся какие-то законы – это не повод их нарушать, это повод вносить изменения.*

По его мнению, основная задача университетов, где работает элита общества, стать объединяющим центром наиболее прогрессивной молодёжи, ответственных за свои решения специалистов и новых лидеров.

Свои вопросы задали губернатору представители коллектива университета. Они касались проведения выборов и подсчёта голосов, ответственности за пострадавших во время митингов и отсрочки от армии, обеспечения порядка на улицах города и поддержки публикации научных трудов учёных, а также строительства спортивных сооружений для развития игровых видов спорта.

**Татьяна СУШКО.**
**Фото Ярослава ВАНЮКЕВИЧА**

# Волнительный момент

**Торжественное мероприятие, посвящённое началу нового учебного года, прошло в ГрГУ имени Янки Купалы. Ректорат, деканы факультетов, представители профессорско-преподавательского состава и студенты собрались на Площади университетского флага.**









В начале праздничной церемонии студенты, которые за предыдущий учебный период продемонстрировали высокие достижения в области науки, культуры и спорта, а также лидеры студенческого самоуправления вынесли флаг Купаловского университета. Затем к собравшимся с приветственным словом обратилась ректор университета Ирина Китурко. Она подчеркнула волнительный характер этого торжественного момента:

*– Сегодня, как обычно 1 сентября, мы все немного волнуемся. Волнуются и первокурсники, для которых всё только начинается, и студенты старших курсов, которые скоро покинут стены Alma mater, и им придётся выбирать новые жизненные ориентиры. И я хочу пожелать всем нам успехов во всех начинаниях, и пусть новый учебный год откроет новые таланты в нашей большой Купаловской семье!*

Почётным гостем торжественного мероприятия, посвящённого Дню знаний, стал выпускник Купаловского университета, председатель Гродненского областного суда Александр Корзун. Обращаясь к студентам, он выразил уверенность, что они непременно получат достойные знания, которые помогут им стать настоящими профессионалами своего дела.

От всех деканов ГрГУ имени Янки Купалы студентов поздравил декан факультета физической культуры Андрей Навойчик и пожелал успехов в учёбе, здоровья, творчества и исполнения желаний.

Успешной учёбы тем, кто в этом году присоединился к дружной Купаловской семье, пожелала мама первокурсника, доцент кафедры философии педагогического факультета ГрГУ имени Янки Купалы Снежана Семерник.

Традиционно во время торжественного мероприятия, посвящённого Дню знаний, состоялось вручение свидетельств о занесении на Доску почёта «Ими гордится университет». Лучшие студенты, магистранты и аспиранты университета по итогам 2019/2020 года получили свидетельства из рук ректора ГрГУ имени Янки Купалы Ирины Китурко и председателя Гродненского областного суда Александра Корзуна.

**Татьяна БАРАНОВСКАЯ.**
**Фото Ярослава ВАНЮКЕВИЧА**

10 сентября в ГрГУ имени Янки Купалы пройдет конференция студентов, учащихся и магистрантов

Прыёмная кампанія-2020

# Залічаны! або першакурснік–2020

**Дзякуючы зладжанай працы калектыва ўніверсітэта маладая і творчая эліта нашай краіны паспяхова далучылася да Купалаўскай сям'і. Усяго на першы курс было залічана 2298 студэнтаў. Аб тым, якой была ўступная кампанія-2020, нам расказала адказны сакратар Ірына Карлюкова.**



Сёлета прыёмная кампанія ўніверсітэта была асаблівай. Яна праходзіла з улікам напружанай эпідэміялагічнай сітуацыі ў краіне. Для арганізацыі аптымальнай працы неабходны былі наватўвядзенні, якія датычыліся ў першую чаргу тэхнічных аспектаў падачы дакументаў і здачы ўступных іспытаў.

Па словах Ірыны Аляксандраўны, электронная рэгістрацыя, а таксама дыстанцыйнае кансультаванне абітурыентаў і іх бацькоў, што ўпершыню сёлета былі рэалізаваны ў ГрДУ імя Янкі Купалы, дапамаглі не толькі захаваць меры засцярогі, але і значна зэканоміць час як абітурыентаў, так і супрацоўнікаў прыёмнай камісіі.

Тыдні хваляванняў скончыліся. Звязаць сваё жыццё з ГрДУ імя Янкі Купалы абралі 1 088 хлопцаў і дзяўчат, якія будуць навучацца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Амаль на сотню больш у параўнанні з мінулым годам – 1 210 чалавек – будуць навучацца на платнай аснове, з іх дзевяць чалавек залічаны звыш лічбаў прыёму па хадатайніцтве спартыўнай федэрацыі.

– *На дзённую і завочную формы атрымання вышэйшай адукацыі за кошт рэспубліканскага бюджэту было пададзена 2 254 заявы пры плане прыёму 1 088 чалавек. Такім чынам, конкурс сярод абітурыентаў склаў 2,07 чалавека на месца,* – паведаміла адказны сакратар прыёмнай камісіі.

У шэрагі першакурснікаў без уступных іспытаў на бюджэтную форму былі залічаны 72 абітурыенты, шэсць з якіх з'яўляюцца пераможцамі заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды, пяць маюць высокія спартыўныя і творчыя дасягненні.

Так, у Купалаўскую сям'ю на факультэт фізічнай культуры трапіў удзельнік алімпійскіх гульняў па хакеі ў складзе нацыянальнай зборнай Рэспублікі Беларусь 2002 года Леанід Фацікаў, які абраў завочную форму навучання. Яму 52 гады, і ўзрост, па яго словах, не можа быць перашкодай, калі чалавек жадае бесперапынна развівацца.

На бюджэтную форму залічаны 38 чалавек, якія маюць дыпломы з адзнакай, а таксама залатыя ці срэбраныя медалі і паступалі на педагагічныя ці запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці. 20 абітурыентаў скончылі профільныя класы педагагічнай накіраванасці і паступілі на педспецыяльнасці па субяседаванні. Тры абітурыенты прыйшлі на ваенны факультэт па накіраванні Мінскага суворАўскага вучылішча.

49 чалавекам пашанцавала трапіць ва ўніверсітэт у якасці студэнтаў па-за конкурсам на дзённую і завочную формы атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. На ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ў 2020 годзе студэнтамі сталі 55 чалавек.

Сёлета быў аб'яўлены набор на новыя спецыяльнасці "Штучны інтэлект", "Прамысловыя робаты і робататэхнічныя комплексы", "Дызайн (віртуальнага асяроддзя)" і "Спартыўна-педагагічная дзейнасць (трэнерская работа з указаннем віду спорту)".

Упершыню адбыўся набор на завочную скарочаную дыстанцыйную форму навучання. Як паказаў конкурс, спецыяльнасці аказаліся вельмі запатрабаванымі. Так, на спецыяльнасць "Дашкольная адукацыя" конкурс склаў 4,5 чалавека на месца, на спецыяльнасць "Транспартная лагістыка" – 4,4, на спецыяльнасць "Пачатковая адукацыя" – 2,8, на "Турызм і гасціннасць" – 1,7 чалавека на месца.

– *Такая форма навучання аказалася прымальнай для людзей, якія пастаянна працуюць. Ім вельмі зручна, што пры навучанні будуць выкарыстоўвацца інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі і электронныя сэрвісы, а прыходзіць ва ўніверсітэт неабходна будзе толькі падчас здачы залікаў ці экзаменаў,* – адзначыла Ірына Карлюкова.

Першакурснікам з найбольшай колькасцю балаў стала Рэната Новік, якая набрала 391 бал. У лідарах па суме балаў Максім Назараў, які мае два 100-бальныя сертыфікаты па матэматыцы і фізіцы і агульны бал 378, а таксама Яўген Занеўскі з агульным балам 377. З балам 371 на спецыяльнасць "Міжнароднае права" залічана Анастасія Гулецкая і на спецыяльнасць "Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (міжнародны турызм)" Алеся Шыплюк.

1004
ХЛОПЦЫ



1294
ДЗЯЎЧЫНЫ



149
СКОНЧЫЛІ ШКОЛУ З ЗАЛАТЫМ МЕДАЛЁМ

74,6%
З ГРОДНА І ВОБЛАСЦІ



25,4%
З ІНШЫХ РЭГІЁНАЎ

## З некаторымі выдатнікамі нам удалося паразмаўляць



**Рэната Новік** паступіла на спецыяльнасць "Сучасныя замежныя мовы". Дзяўчына скончыла гімназію г. Шчучын з залатым медалём. На ЦТ па гісторыі Беларусі набрала 99 балаў, па англійскай мове 98 балаў і 96 па беларускай мове. Рэната займалася паглыбленым вывучэннем англійскай мовы з пятага класа, удзельнічала ў алімпіядным руху, станавілася пераможцам у раённых і абласных этапах алімпіяды. Захапілася англійскай мовай дзякуючы сваёй школьнай настаўніцы. Рыхтавалася да здачы ЦТ самастойна.

– *Пры выбары спецыяльнасці я кіравалася магчымасцю атрымаць веды і развіць навыкі не толькі ў сферы выкладання, але і перакладчыцкай дзейнасці. Да таго ж хацелася вывучаць, акрамя англійскай мовы, нямецкую і французскую. І менавіта такая магчымасць ёсць у ГрДУ імя Янкі Купалы,* – падзялілася Рэната.



**Яўген Занеўскі** паступіў на спецыяльнасць "Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі". Ён скончыў Вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад-сярэдняя школа аграгарадка Луцкаўляны з залатым медалём. ЦТ па матэматыцы здаў на 100 балаў, па англійскай мове – 91 бал і 88 па рускай мове. Некалькі год Яўген навучаўся на падрыхтоўчых курсах "Алімп" факультэта даўузаўскай падрыхтоўкі ГрДУ імя Янкі Купалы. Актыўна ўдзельнічаў у алімпіядным руху па матэматыцы.

Любоў да царыцы навук нарадзілася дзякуючы маме – настаўніцы матэматыкі:

– *Магчыма, калі б не мама, то не было б у мяне таго захаплення матэматыкай. Добрая база ў школе па прадмеце, навучанне на курсах ФДП, удзел у алімпіядах – усё гэта спрыяла імкліваму пошуку рашэння задач і развіццю логікі. Таму 100 балаў на ЦТ – гэта для мяне чаканы вынік.*



З высокім балам у Купалаўскі ўніверсітэт на спецыяльнасць "Міжнароднае права" паступіла **Анастасія Гулецкая**. У яе 100-бальны сертыфікат па англійскай мове, 92 балы ў сертыфікаце па грамадазнаўстве і 86 – па рускай мове. Замежную мову пачала вывучаць у садку, прымала актыўны ўдзел у алімпіядах і чытала кнігі па-англійску. Таму высокі бал на ЦТ з'яўляецца для дзяўчыны заканамерным вынікам плённай працы.

– *Лічу, што ў сучасным свеце веды ў галіне міжнароднага права з'яўляюцца неабходным інструментам для новага ўзроўню развіцця грамадства, у тым ліку і нашай краіны. Менавіта таму я і спыніла свой выбар на спецыяльнасці "Міжнароднае права".*

А Купалаўскі ўніверсітэт дзяўчына абрала дзякуючы станоўчым водгуках знаёмых, якія таксама скончылі ГрДУ імя Янкі Купалы.

**Жадаем нашым першакурснікам плённай і цікавай вучобы, а таксама актыўнага ўдзелу ў пазавучэбным жыцці ўніверсітэта! Можна не сумнявацца, што ўсе амбіцыйныя маладыя людзі дасягнуць поспеху і стануць вядомымі. А іх Alma mater дасць магчымасць для самавыяўлення яшчэ падчас вучобы. Таму – наперад, першакурснік–2020!**

СОБЫТИЕ

# СТРАТЕГИЯ БУДУЩЕГО

**Расширенный Совет университета, приуроченный к началу нового учебного года, прошёл в ГрГУ имени Янки Купалы. На торжественном мероприятии, которое состоялось 2 сентября, подвели итоги 2019-2020 учебного года и обозначили ряд стратегических задач на текущий год.**

На заседании Совета присутствовали представители профессорско-преподавательского состава университета, сотрудники и студенты, а также приглашённые гости – заместитель Министра образования Республики Беларусь Сергей Рудый, заместитель председателя Гродненского областного исполнительного комитета Виктор Пранюк и начальник главного управления образования Гродненского областного исполнительного комитета Руслан Абрамчик.

Поздравив коллег с новым учебным годом, ректор Ирина Китурко представила основные результаты работы университета за прошлый год.

*– Буквально несколько часов назад мы открыли новое студенческое общежитие. Это событие стало для нас настоящим подарком ко Дню знаний,* – подчеркнула Ирина Фёдоровна в начале своего выступления.

Также она отметила, что предыдущий учебный год ознаменован празднованием 80-летия университета, которое стало корпоративным мероприятием и объединило всех Купаловцев, в том числе и благодаря проведению первого Съезда выпускников. Несмотря на ряд праздничных событий, сотрудники университета не прекращали выполнять будничные дела, которые способствовали осуществлению задач, поставленных на 2019-2020 учебный год. Среди них Ирина Фёдоровна выделила пять основных, решение которых носило комплексный характер.

## Реализация проекта «Цифровой университет+»

Целью проекта «Цифровой университет+» является повышение качества и эффективности деятельности университета посредством широкого реинжиниринга всех процессов и внедрения инновационных бизнес-моделей на основе модернизации информационно-коммуникационной среды.

В рамках осуществления проекта «Цифровой университет+» неоспоримым достижением минувшего учебного года стал внедрённый сервис «Цифровая приёмная комиссия», в создании которого приняли участие сотрудники и студенты университета. Сервис предоставляет абитуриенту широкие возможности не просто подать документы в приёмную комиссию для предварительного изучения, но и получить консультации специалистов, ознакомиться со всеми специальностями Купаловского университета и выбрать свою. Электронная очередь позволила не только существенно сэкономить время, но и соблюсти правила социального дистанцирования в период неблагоприятной эпидситуации.

Кроме того, ряд созданных университетских цифровых сервисов позволил значительно облегчить работу. Также преподаватели университета освоили и активно использовали в своей деятельности мировые цифровые площадки.

Следующим шагом должны стать формирование цифрового мышления и цифровая трансформация университета. Для этого необходимо создание цифровых сервисов в области науки, например, интегрированного цифрового ресурса «Наука» и интегрированного цифрового ресурса журнала «Вестник». Это позволит автоматизировать работу между автором, рецензентом и редактором, а также отслеживать в режиме онлайн статус публикации и автоматически проверять на наличие плагиата. Не менее важной является реализация проекта «Science-ID» и создание «Виртуальной выставки».



Задача на новый учебный год: разработка стратегии цифровой трансформации университета на ближайшие пять лет.

## Развитие системы работы с одарённой и талантливой молодёжью

В университете налажена и совершенствуется система выявления и развития одарённой и талантливой молодёжи, направленная на реализацию потенциала личности каждого студента. Поступив в университет, все студенты становятся частью большой Купаловской семьи, в которой существует множество возможностей, чтобы в полной мере выявить, раскрыть и реализовать таланты каждого студента, что и отражает Миссия университета. Чтобы работа с одарённой и талантливой молодёжью приносила плоды, необходимо участие каждого структурного подразделения университета. В ГрГУ имени Янки Купалы сделано немало, чтобы заинтересовать молодёжь. Существуют республиканские и университетские фонды, из которых можно получить финансовую поддержку, в том числе на реализацию стартап-проектов. Ирина Фёдоровна отметила ителлектуальные командные достижения студентов в международных турнирах и олимпиадах благодаря усилиям педагогов и выразила надежду на то, что таких проектов по работе с одарённой и талантливой молодёжью в университете будет больше.

Задача на новый учебный год: создать для каждого студента индивидуальную программу развития и сопровождения.

## Повышение позиции университета в международных рейтингах

Сегодня по оценкам международных рейтингов ГрГУ имени Янки Купалы занимает третье место среди университетов Республики Беларусь. Это позволяет успешно участвовать в международных программах и проектах, привлекать абитуриентов из десятков стран.

По словам Ирины Фёдоровны, коллективу университета необходимо трудиться над созданием совместных образовательных программ и совершенствованием академической мобильности. Для того чтобы не только сохранить позиции в международных рейтингах, но и подняться выше, необходимы статьи в высокорейтинговых научных журналах.

## Обеспечение роста доходов, в том числе экспорта

Ректор университета Ирина Китурко отметила выполнение плана по образовательным услугам в прошлом учебном году, увеличение среднемесячной заработной платы и заострила внимание на необходимости экспорта наукоёмкой продукции и инновациях:

*– Инновации – это то, что нам сегодня необходимо. Мы гордимся, что в прошлом году наш студент 2 курса факультета математики и информатики создал свою компанию и стал резидентом Научно-технологического парка. В этом году мы вводим вторую очередь Научно-технологического парка, что позволит не только привлечь сторонние организации, но и подготовить резидентов из своих сотрудников и студентов.*

## Развитие корпоративной культуры

Одним из достижений прошлого учебного года стало создание и принятие «Корпоративного кодекса» ГрГУ имени Янки Купалы:

*– Мы обозначили ряд качеств, которыми должен обладать Купаловец, а также то, чем он должен руководствоваться в своей деятельности. Принятие Кодекса должно стать значительной вехой в дальнейшем развитии корпоративной культуры нашего университета. Само время требует от нас сплочённости. А объединенный общими идеями коллектив работает намного эффективнее,* – подчеркнула ректор.

В конце своего выступления она акцентировала внимание на том, что предстоящий учебный год будет своеобразным переходным периодом, когда завершится реализация Стратегии университета 2015–2020 года и начнётся разработка целей и задач, которые войдут в стратегию на следующие пять лет.

**Татьяна СУШКО.**
**Фото Ярослава ВАНЮКЕВИЧА**



Представители Купаловского университета приняли участие в веломарафоне «За Беларусь»

Событие

# Дом для тысячи студентов



**Современное 13-этажное здание на 1030 мест с безбарьерной средой – пятое общежитие для студентов ГрГУ имени Янки Купалы – принимает своих первых новосёлов. Торжественное открытие общежития с участием почётных гостей – заместителя Министра образования Сергея Рудого и председателя Гродненского областного исполнительного комитета Владимира Караника – состоялось 2 августа.**

В Гродненском государственном университете имени Янки Купалы жилищный вопрос для иногородних студентов всегда стоял остро, ведь учиться сюда приезжают не только из Гродненской области, но и со всей республики и даже ближнего и дальнего зарубежья. К сожалению, обеспечить всех желающих местами в общежитии не представлялось возможным.

В 2014 году было начато строительство нового общежития на улице Дубко. При закладке фундамента были использованы средства университета. Стройку пришлось заморозить на четыре года. Судьбоносным для Купаловцев стал октябрь 2018 года, когда университет с рабочим визитом в Гродно посетил Президент Республики Беларусь Александр Лукашенко. В ходе ознакомления с текущими делами ему продемонстрировали макет студенческого городка и рассказали о начале строительства нового общежития, в котором так нуждался университет. Тогда Александр Лукашенко пообещал найти средства на строительство. Работы были возобновлены в апреле 2019 года и проводились точно по графику.





Сегодня общежитие принимает своих новосёлов. На первом этаже 13-этажного здания предусмотрены места для студентов с повышенными потребностями, гостевой блок для родственников, которые посещают студентов. Здесь расположились руководство студенческого городка, кабинет психолога, комната психологической разгрузки, административно-хозяйственные помещения. Ребята смогут воспользоваться буфетом, где организовано горячее питание, прачечной, оборудованной стиральными машинами-автомат, гладильной комнатой. На каждом этаже – 14 блоков по три комнаты на двух человек, всего общежитие готово принять 1030 жильцов.



Проживание студентов в новом общежитии обещает быть не только комфортным, но и интересным с точки зрения разнообразной организации досуговой деятельности. Здесь будут работать спортивные секции с инструктором по физической культуре, творческие коллективы хореографической, театральной, вокальной направленности. Уже закуплен и установлен спортивный инвентарь для тренажёрного зала.

Как рассказала начальник управления воспитательной работы с молодёжью ГрГУ имени Янки Купалы Оксана Котова, для заселения в новое общежитие каждый факультет имел возможность выбрать лучших студентов по трём направлениям деятельности: учебной, научной и общественной. Таким образом было отобрано 15 % студентов от общего количества очередников:

*– Ребята, обучающиеся на втором, третьем, четвёртом и пятом курсах, получили такую возможность. Кроме того, планируется в этом году заселить в общежитие порядка 300 студентов-иностранцев.*

**Татьяна СУШКО.**
**Фото Сергея МОРОЗОВА, Ярослава ВАНЮКЕВИЧА**





Студенты ГрГУ стали первыми в чемпионатах Беларуси по пляжному футболу, пулевой стрельбе и других видах спорта

**VIVAT, ПЕРШАКУРСНІК!**

# З ГОДНАСЦЮ НЕСЦІ ЗВАННЕ "СТУДЭНТ"



**Напярэдадні навучальнага года, 31 жніўня, прайшла традыцыйная сустрэча кіраўніцтва Купалаўскага ўніверсітэта з першакурснікамі дзённай формы навучання.**

Вітаючы першакурснікаў, рэктар ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына Кітурка адзначыла, што сёлета да Купалаўскай сям'і далучылася 2298 студэнтаў:

*– З сённяшняга дня мы будзем крочыць па жыцці разам. Вы выбралі наш універсітэт, і мы зробім ўсё магчымае, каб спраўдзіць вашы надзеі і чаканні.*

Ірына Фёдараўна прачытала студэнтам першую лекцыю пад назвай "Універсітэт тваіх магчымасцяў". У ёй – яркія старонкі гісторыі і сучаснасці Купалаўскага ўніверсітэта, дасягненні студэнтаў і выпускнікоў у навуцы, творчасці і спорце. Па традыцыі студэнцкія білеты атрымалі першакурснікі ўніверсітэта і каледжаў, якія паказалі высокія вынікі падчас сёлетняй уступнай кампаніі.

З паступленнем у Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы першакурснікаў павіншавалі студэнт 4 курса фізіка-тэхнічнага факультэта, старшыня студэнцкага самакіравання факультэта, член Каардынацыйнага студэнцкага савета ўніверсітэта Кірыл Саковіч і студэнтка 3 курса педагагічнага факультэта, старшыня студэнцкага самакіравання факультэта, член Каардынацыйнага студэнцкага савета ўніверсітэта Дар'я Дабрыянец, якія перадалі малодшым калегам сімвалічны студэнцкі білет і ключ ведаў.

Права прыняць сімвалы студэнцтва было прадстаўлена першакурсніку-курсанту ваеннага факультэта, члену Нацыянальнай зборнай па плаванні, кандыдату ў майстры спорту Аляксандру Кандрашкіну і студэнтцы філалагічнага факультэта Паліне Пучко, якой пашанцавала стаць тысячнай абітурыенткай падчас прыёмнай кампаніі.

Завяршылася ўрачыстае мерапрыемства цырымоніяй клятвы першакурснікаў. Купалаўцы паабяцалі з годнасцю несці званне студэнта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, не шкадаваць сіл і часу на спасціжэнне ўсіх навук, быць годнымі пераемнікамі традыцый беларускага студэнцтва, ва ўсім выступаць узорам сумленнасці, высакароднасці, працавітасці, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім, навуковым і культурным жыцці роднай Alma mater, атрымаваць веды накіроўваць на ўмацаванне сваёй краіны.

**Таццяна СУШКО.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА**

**INTERВУЗ**

# ИЗУЧАЙ И ИССЛЕДУЙ!

**Этим летом для желающих изучить и усовершенствовать русский язык представилась уникальная возможность посетить Летнюю академию-2020 ГрГУ имени Янки Купалы. А традиционную Летнюю школу русского языка организаторы – кафедра языковой подготовки белорусских и иностранных граждан факультета довузовской подготовки – перенесли на начало октября.**

Под крышей Купаловского университета с 16 по 29 августа собрались наиболее жаждущие изучать великий и могучий. Ими стали представители Венгрии, Германии, Ирака и Канады. Самый активный – Бернд Адам из Германии, служащий компании SuperIllu Verlag GmbH&Co, который приезжает в Купаловский университет изучать русский язык каждое лето уже пятый год подряд. Как отметила заведующий кафедрой языковой подготовки белорусских и иностранных граждан ГрГУ имени Янки Купалы Инна Самойлова, именно Бернд Адам и его неутолимое желание знать русский язык побуждает организаторов искать новые и интересные формы работы.

Владеть русским языком желает и будущий специалист в сфере туризма, магистрант из Венгрии Арон Бекефи. Той же целью движим и Зайед Ибрагим Хамид Заейд из Ирака, который учится в магистратуре ГрГУ имени Янки Купалы на инженерно-строительном факультете.

Проект Летней академии-2020, ставший альтернативой Летней школе русского языка, реализуется в университете впервые. Особенность проекта в том, что он не только образовательный, но и содержит в себе элементы науки – участники, изучая язык, проводят простейшие исследования в области прикладной лингвистики.

*– Работа академии построена таким образом, что в первой половине дня слушатели изучают русский язык, а во второй – занимаются научной деятельностью. Мы предложили им направления прикладной лингвистики. Стоит отметить, что ни один из участников Летней академии не является филологом, поэтому предлагаемые направления исследований для них совершенно новые,* – пояснила Инна Самойлова.

Участники проекта к концу двухнедельного интенсива не только успели усовершенствовать свои знания, но и открыть для себя Беларусь и найти новых друзей.

**Татьяна СУШКО.**

## С какими сложностями при изучении русского языка пришлось столкнуться, слушатели рассказали читателям нашей газеты

**Оливье Лафон-Уаиз (Канада)**

Долго не мог запомнить слово «здравствуйте», а вот «привет» быстро усвоил. Трудно произносить звук [ы] и слова с мягким знаком. Нелегко справиться с падежами.



**Зайед Ибрагим Хамид Зайед (Ирак)**

Я долго учился произносить звук [ц], например, в словах «цветы» и «птицы».



**Арон Бекефи (Венгрия)**

Постоянно путаю тринадцать и тридцать или двенадцать и двадцать. Также трудности вызывает разноместное ударение в русском языке.



**Бернд Адам (Германия)**

Сложны для восприятия разговорные фразы, непросто понять быструю речь на слух. Трудности вызывает использование совершенного и несовершенного видов глагола.



Представители ГрГУ встретились онлайн с литовскими партнерами проекта по инвазивным видам растений

Спорт

# Спартыўныя традыцыі Купалаўцаў

**ГрДУ імя Янкі Купалы – не толькі ўстанова, якая забяспечвае атрыманне вышэйшай адукацыі, але і добрая пляцоўка для падрыхтоўкі і прафесійнага росту спартсменаў. Доказам таму з'яўляюцца штогадовы ўдзел, высокія дасягненні і перамога Купалаўцаў у Рэспубліканскай універсіядзе па розных відах спорту. Па выніках спаборніцтваў–2019 універсітэт заняў першае месца.**

Месцы ў першай групе размеркаваліся наступным чынам:

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры – абсалютны чэмпіён
**1 месца – Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы**
2 месца – Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт
3 месца – Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка
4 месца – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
5 месца – Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны
6 месца – Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна
7 месца – Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
8 месца – Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова

За званне найлепшай змагалася 51 установа вышэйшай адукацыі рэспублікі. Спаборніцтвы праводзіліся па 33 відах спорту, з якіх 24 – алімпійскія, а таксама па летнім і зімовым шматбор'і.

Па выніках фінальных спаборніцтваў Рэспубліканскай універсіяды-2019 абсалютным пераможцам стаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры. Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы заняў першае месца ў першай групе ўдзельнікаў. Другім стаў Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, на трэцім месцы – Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка.

У 45 відах спаборніцтваў універсіяды ўсяго выступіла 430 Купалаўцаў, якія заваявалі 14 прызавых агульнакамандных месцаў і сталі пераможцамі ў першай групе ўдзельнікаў.

Як паведаміў начальнік спартыўнага клуба Кірыл Акуліч, першая група ўключае спартсменаў, якія навучаюцца ва ўстановах вышэйшай адукацыі абласных цэнтраў або ва ўстановах, дзе ёсць спецыяльнасць "Фізічная культура і спорт" і на дзённай форме займаецца больш за 10 000 студэнтаў з улікам 10 працэнтаў студэнтаў завочнай формы навучання. Менавіта ў гэтую групу з дзевяці ўніверсітэтаў нашай краіны і ўваходзіць ГрДУ імя Янкі Купалы:

*– Фактычна мы першыя сярод універсітэтаў класічнага тыпу і другія пасля спецыялізаванага ўніверсітэта фізічнай культуры. Сапраўды, гэта вельмі годны вынік.*

Не было роўных студэнтам-купалаўцам у грэка-рымскай барацьбе, баскетболе сярод жанчын, вольнай барацьбе сярод мужчын, гандболе сярод мужчын, барацьбе самба сярод жанчын. Высокім узроўнем майстэрства яны пакарылі служыцеляў Феміды і заваявалі законнае першае месца.

Дзесьці вельмі пераканаўча, дзесьці ў напружанай барацьбе былі пераможна пройдзены апаненты па такіх відах спорту, як баскетбол і дзюдо сярод мужчын, валейбол сярод жанчын. У выніку спаборніцтваў па гэтых відах спорту Купалаўцы падняліся на другую ступень п'едэстала.

З поспехам яны абышлі і візаві па вольнай барацьбе, дзюдо і гандболе сярод жанчын, а таксама па лёгкай атлетыцы ў памяшканні, кулявой стральбе, веславанні на байдарках і каноэ, адваяваўшы па гэтых відах спаборніцтваў трэцяе месца.

Як распавяла інструктар па фізічнай культуры ГрДУ імя Янкі Купалы Марына Ясене, у тым, што Купалаўцы апынуцца ў фіналістах у спаборніцтвах па барацьбе, не сумняваўся ніхто:

*– Барацьба і гульнявыя віды спорту ў нас заўжды на вышыні. У спаборніцтвах па грэка-рымскай барацьбе ў нас наогул ніколі не было другога месца, толькі першае. Па грэка-рымскай барацьбе вельмі моцная школа і наладжана выдатная сувязь з Гродзенскім дзяржаўным вучылішчам алімпійскага рэзерву, выпускнікі якога прадаўжаюць вучобу ў Купалаўскім універсітэце.*

Марына Ясене таксама адзначыла, што студэнты ГрДУ імя Янкі Купалы нечакана бездакорна паказалі сябе ў гандболе сярод мужчын і бліскуча занялі першае месца. Крыху саступілі гандбалісткі, але таксама паказалі годны вынік – трэцяе месца:

*– На здзіўленне вельмі дапамаглі прабіцца ў фінал віды спорту, на якія ніхто не ставіў ніякіх надзей – тайландскі бокс, тэквандо, тэніс. У спаборніцтвах па гэтых відах спорту Купалаўцы занялі чацвёртае месца.*

Варта адзначыць, што ГрДУ імя Янкі Купалы заўсёды быў не супраць пазмагацца за званне лепшага ў студэнцкіх спартыўных спаборніцтвах, бо яму сапраўды ёсць што паказаць. З 2012 года ўніверсітэт уваходзіць у тройку лідэраў спартыўных спаборніцтваў сярод універсітэтаў рэспублікі.

*– Удзел у Рэспубліканскай універсіядзе – гэта добрая традыцыя не толькі з пункту гледжання далучэння моладзі да здаровага ладу жыцця, масавага спорту, гэта таксама магчымасць паказаць вынікі і зрабіць вядомым наш універсітэт,* – падкрэсліў начальнік спартыўнага клуба Кірыл Акуліч.

**Таццяна СУШКО.**



Каманда ГрДУ імя Янкі Купалы па баскетболе



Зборная ГрДУ імя Янкі Купалы па вольнай барацьбе

Студенты и выпускники ГрГУ в числе победителей чемпионата Республики Беларусь по легкой атлетике

**Памяць**

# Памяці Дзмітрыя Лебядзевіча



**27 мая 2020 года на 62 годзе пайшоў з жыцця Дзмітрый Мікалаевіч Лебядзевіч, літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Беларуская навука страціла таленавітага вучонага, удумлівага даследчыка, спецыяліста ў галіне антычнай і старажытнай літаратуры.**

Дзмітрый Мікалаевіч нарадзіўся на Шчучыншчыне 6 кастрычніка 1958 года. Рана страціў бацькоў. З дзіцячых гадоў вызначаўся адказнасцю, працавітасцю, кемлівасцю, стараннасцю як у вучобе, так і ў працы. Пасля заканчэння школы вучыўся ў Гродзенскім медыцынскім вучылішчы. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце, закончыўшы ў 1988 годзе філалагічны факультэт па спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура".

Свой працоўны шлях Дзмітрый Лебядзевіч пачынаў фельчарам. А з 1983 года перайшоў на педагагічную працу, пачаў працаваць настаўнікам рускай мовы і літаратуры. У школах Гродзенскага раёна высока цанілі ініцыятыўнага і дасведчанага філолага.

З 1989 года свой лёс Дзмітрый Мікалаевіч звязаў з філалагічным факультэтам Гродзенскага ўніверсітэта, дзе ён працаваў на пасадах выкладчыка, старшага выкладчыка, дацэнта ўніверсітэта. Дзмітрый Мікалаевіч шмат вучыўся сам і вучыў іншых. У 1997 годзе паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю "Антычныя традыцыі ў беларускай літаратуры XIX — пачатку XX стагоддзя".

У гісторыі філалагічнага факультэта і ўніверсітэта Дзмітрый Мікалаевіч пакінуў прыкметны след: ён узначальваў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта, на працягу многіх гадоў быў загадчыкам кафедры беларускай літаратуры. Пад яго кіраўніцтвам абаронены шматлікія курсавыя, дыпломныя, магістарскія работы.

Як выключны спецыяліст у галіне старажытнай літаратуры Дзмітрый Мікалаевіч распрацаваў і чытаў курсы па гісторыі антычнага мастацтва слова, беларускай літаратуры XIX стагоддзя, па гісторыі антычнага красамоўства і многія іншыя. Яго дасведчанасць у названых напрамках прызнавалася не толькі калегамі па кафедры, яго высока цанілі даследчыкі і навукоўцы з БДУ, Брэсцкага ўніверсітэта імя А. Пушкіна і іншых навучальных устаноў краіны. Шмат публікацый Дзмітрыя Лебядзевіча выходзіла ў замежных выданнях, уключалася ў матэрыялы міжнародных канферэнцый, друкавалася ў навуковых зборніках. У навуковым набытку прызнанага літаратуразнаўцы манаграфіі, хрэстаматыі, звыш сотні артыкулаў і дакладаў.

На факультэце засталася памяць пра Дзмітрыя Мікалаевіча як уважлівага, зычлівага чалавека, якога высока цанілі кіраўніцтва факультэта, студэнты, магістранты і выкладчыкі-калегі. Непапраўнай стратай для родных і блізкіх стала яго заўчасная смерць.

Жыццё Дзмітрыя Мікалаевіча Лебядзевіча абарвалася неспадзявана, не стала цікавага, дзейнага, жыццелюбівага чалавека, у якога было яшчэ многа задуманых планаў і праектаў.

Няхай светлай памяццю застанецца ўсё добрае, што звязана з імем гэтага чалавека.

**Калектыў кафедры беларускай філалогіі.**

**Это важно знать**

# Помощь рядом

**Сложная ситуация в жизни? Трудно понять себя? Не получается обрести гармонию с собой и окружающим миром? Не знаешь, как дальше жить?.. Вот уже более десяти лет скорой помощью для обучающихся является социально-педагогическая и психологическая служба университета. Внимательные сотрудники выслушают каждого и окажут эмоциональную поддержку, гарантируя безопасность и полную конфиденциальность.**

**Направления деятельности социально-педагогической и психологической службы университета:**

- социальная адаптация
- организация жизнедеятельности (включая жилищно-бытовые вопросы)
- организация самоподготовки

**Помощь первокурсникам**

- Как жить самостоятельно без родителей
- Как вести бюджет и преодолеть материальные трудности
- Как справиться с интенсивностью и загруженностью учебного процесса
- Как наладить отношения с проживающими в одной комнате общежития
- Как преодолеть страх
- Как справиться со стрессом (в том числе и предэкзаменационным) и депрессией

**Получи консультацию специалистов**

+375 (152) 41-02-27

БЛК, 3, каб.1

SPPS_grsu@mail.ru.

*Не оставайся наедине с проблемой!*



GAZETA.GRSU.BY

**ЗАСНАВАЛЬНІК:**
**УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1083.
Выдадзена 21.01.2010 г.
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Падпісана да друку:** 07.09.2020 у 09.00.
**Аб'ём** – 8 друк. арк. **Тыраж** 1000 экз. **Заказ** № 3647.
**ДРУК:** ГАУПП «Гродзенская друкарня», 230025, г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4.
ЛП 02330/39 ад 27.03.2014 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
вул. Ажэшкі, 22, пакой 335, 230023, Гродна.
**Тэл.:** 32-02-29. **E-mail:** grod_univ@grsu.by
**Рэдактар:** Сушко Таццяна Сяргееўна
**Мастацкі рэдактар:** Ботвінка Ганна Уладзіміраўна